

ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

1992 ЛІСТАПАД 10 Аўторак

№ 213 (398)

Цана 1 рубель

СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

● В МИНГОРСОВЕТЕ

ЦЕНЫ НЕ УДЕРЖАТЬ...

ОЛЬГА ЖАРИНА, «ДВ».

ВЧЕРА в Мингорсовете состоялась пресс-конференция заведующего отделом ценообразования Мингорисполкома М. Ф. Черномазова.

Началась она с рассказа о том, как готовилась реформа цен в Беларуси. Михаил Филиппович поделился, что эта реформа была рассчитана примерно на 10 лет и предусматривала постепенную либерализацию цен. Но когда в бывшем Союзе началось противостояние двух группировок—«шаталинской» и «абалкинской», уже разработанная концепция ценообразования была «похоронена». А вместо нее началась резкая гонка цен в России и как следствие—у нас. Теперь же остановить бешено вращающееся колесо почти невозможно. А это значит, что нас снова ждет очередное и, вероятно, большое подорожание.

Пока трудно называть конкретные цифры, они еще только рассматриваются, обсуждаются. Можно лишь говорить о том, что планируется, а будет ли введено, в каком виде и когда, точно сказать трудно. И все же Совмин предполагает поднять тарифы на коммунальные услуги для населения: за пользование водопроводом и канализацией—в 3 раза, на тепло- и электроэнергию—в 2 раза. Баллон сжиженного газа будет стоить около 120 руб. Тарифы на квартплату планируют оставить прежними, но платить не только за жилую площадь, а за общий метраж.

Решается вопрос и о введении с нового года (?) свободных цен на продовольственные товары, на которые пока установлена фиксированная цена, а это мясные, молочные продукты, хлеб, сахар, водка. Но даже если останется госдотация на эти виды продовольствия, цены на продукты все равно придется повысить примерно в 2 раза, чтобы окупить расходы на их производство. Спиртное, возможно, подорожает в 1,5 раза. А вот рост зарплаты планируется в 1,7 раза.

На пресс-конференции были заданы и более конкретные вопросы. Например, почему в ноябре в некоторых магазинах продается сахар по 50 рублей, а в других—по 80? Будут ли дорожать, о чем давно говорилось, холодильники, телевизоры?

Вот что ответил М. Ф. Черномазов.

— С 1 ноября сахар должен продаваться по 80 рублей, кроме тех остатков, которые были завезены в октябре и не реализованы. Если магазины продают продукт по 50 р.—это нарушение. Городские власти приняли решение, чтобы предприятия торговли, реализовавшие в ноябре сахар по 50 рублей, внесли недостающую сумму в бюджет города. Эти деньги пойдут на организацию школьного питания.

Что касается холодильников и телевизоров, то заведующий отделом ценообразования подтвердил, что с ноября эти товары стали дороже на 40—60 процентов. А вот новые цены на парикмахерские услуги, которые планировало ввести с октября ПО «Восход», не были утверждены Мингорисполкомом. Так что пока парикмахерские должны работать по старому прейскуранту.

«МЫШКИ» В «ШОКЕ»

Б. РОБИН, РИД.

НА ПРАЗДНИКЕ некоммерческого искусства «Артишок», организованном газетой-клубом «Такая жизнь-2» и генеральным спонсором ПКФ «Профико» во Дворце культуры железнодорожников с 4 по 10 ноября, вместе с выставкой авангардной живописи проходят спектакли театра-студии Рида Талипова и театра «Акт» (руководитель Виталий Барковский). А для любителей нетрадиционной, атональной музыки сообщаем, что каждый вечер в главном выставочном зале можно услышать «мышиную возню» минской группы «Князь Мышкин». Организаторы праздника их так ласково и окрестили — наши «мышки». С первых дней выставки любой посетитель мог послушать эту музыку и, если ему нравилось, принять участие в совместной игре, попеть, даже если этому препятствовали вокальные данные.

СОБИРАЛИ ВМЕСТЕ. КАК ПОДЕЛЯТ?

СВЕТЛАНА КУЛИКОВА, БЕЛАПАН.

МЕЖДУНАРОДНАЯ неправительственная организация «Чернобыль — помощь» в настоящее время занята нелегким трудом. Рассматривается вопрос раздела средств, собранных во время телемарафона, прошедшего около года назад, между чернобыльскими организациями республик развалившегося Союза.

НЕ РИСКУЙТЕ СОБСТВЕННЫМ ЗДОРОВЬЕМ!

ВЫСОКО подпрыгнувшие цены сделали труднодоступными для нас многие продукты питания, но отнюдь не гарантируют такого же уровня качества.

Например, та же капуста, стоившая раньше копейки, а теперь —десятки рублей, ничуть не снизила содержания нитратов и радионуклидов. Настораживающий факт: постепенно закрываются лаборатории по определению степени загрязнения или же переходят на платную форму обслуживания. Но как бы все дорого ни обходилось, здоровье — прежде всего.

Придерживаясь этого лозунга, минский городской фонд помощи жертвам катастрофы на ЧАЭС «26 апреля» и объединение инвалидов Чернобыля создали общественную радиометрическую лабораторию по определению степени радиоактивного загрязнения продуктов питания. Здесь работают опытные специалисты, которые могут установить содержание радиоактивных веществ в любом продукте. Особо ценно то, что в этой лаборатории, разместившейся по ул. Ленинградской, 12, вас обслужат бесплатно.

● ВЫСТАВКИ

«ПОЛЬША-92» «СОБЛАЗНЯЕТ» ТОВАРАМИ

ПАВЕЛ ВАСИН, РИД.

НАКОНЕЦ-ТО белорусско-польское экономическое сотрудничество выходит за рамки примитивной торговли между отдельными обывателями государств. Фирма «Экспо эгзибишнз» гарантирует солидный уровень предпринимателей, которые представят свою продукцию на выставке «Польша-92». Ее проведение намечается на 11—15 ноября в Минске. Белорусским бизнесменам это сулит солидные контракты. Из Польши прибудут образцы сугубо национальной продукции, к примеру, автомобили «Пежо», смонтированные на польских заводах. Предпринимателей из-за Буга интересуют в Беларуси наши технологии, электроника, ресурсы. Между прочим, на выставке будут представлены книги польских авторов.

● ОФИЦИАЛЬНЫЙ ОТДЕЛ

СОБ. ИНФ. «ДВ».

ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ комитет Минского городского Совета народных депутатов зарегистрировал несколько новых общественных организаций: агентство гуманитарных инициатив и технологий «Северо-Запад», которое размещается по адресу: ул. Радиальная, 40; минское городское общество русской культуры «Русь» (ул. К. Маркса, 14); клуб любителей лошадей «Продиус» (ул. Перекопская, 11).

ІНФАРМБЮРО

КАЛЯНДАР

ВОСЕНЬ. 315 ДЗЕНЬ ГОДА.
СОНЦА узышло ў 7.27, зойдзе ў 16.21. Даўжыня дня 8.54.
МЕСЯЦ — поўня (11.21).

ІМЯНІНЫ

СЕННЯ: Арсена, Сцяпана, Царэнція, Праскоўі, Любаміра.
ЗАЎТРА: Клаўдзія, Ганны, Марыі, Настассі, Марціна.

ЯК ПАВЕДАМІЎ ГІДРАМЕТЦЭНТР

СЁННЯ ў 11 гадзін у Мінску было 2 градусы марозу. Ціск 750 мм ртутнага слупа. Адносная вільготнасць 70 працэнтаў. Вецер паўднёва-ўсходні — 3—4 м/сек.

ЗАЎТРА ў Мінску чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, увечары невялікія ападкі. Тэмпература паветра ноччу — 4—6 градусаў марозу, днём — 1—3 цяпла.

ПРИВАТИЗАЦИЯ ПО-ВОХРОВСКИ

ВИКТОР ФЕДОРОВИЧ, БелаПАН.

Неделю назад с неохраняемой площадки Минского подшипникового завода воры унесли 1600 килограммов латунных труб на сумму 267 тысяч рублей. Как стало известно, авторами кражи были рабочий этого же предприятия и... стрелок ВОХРа. Трубы возвращены хозяину.

● ЗЕРКАЛО?

«НИКа» ПОБЕЖДАЕТ МАРИАННУ

АНДРЕЙ КОРСАК, БЕЛАПАН.

ИЗ КАКИХ источников минчане предпочитают получать информацию? Какие телепередачи пользуются наибольшим зрительским спросом? Изучая эти и другие вопросы, социологическая служба информационного агентства БелаПАН опросила 500 человек.

Вот что показали результаты опроса.

Какой вид получения информация вы предпочитаете?

газеты—28%
телевидение—41%
радио—23%
сплетни—8%

Какой канал телевидения вы смотрите с большим удовольствием?

«Останкино»—26%
российский—27%
белорусский—20%
коммерческий—13%
спутниковое телевидение—10%
затрудняюсь ответить—4%

Ваша любимая телепередача (фильм)?

«Богатые тоже плачут»—15%
«Поле чудес»—4%
«Тема»—16%
«Музобоз»—12%
Белорусская MTV-20—3%
«Королевская охота»—4%
«НИКа»—16%
«Навіны»—12%
«Вести»—14%
на сессии Верховного Совета Беларуси—4%

Сколько часов в день вы проводите у телевизора?

до 15 минут—21%
до 1 часа—24%
до 5 часов—39%
все то время, пока нахожусь дома,—16%

Будь вы в состоянии изменить работу телевидения, что бы вы сделали?

увеличил бы количество политических передач—6%
музыкально-развлекательных—32%
«крутил» бы только фильмы—26%
убрал бы передачи на зарубежные темы—4%
отдал бы предпочтение познавательным программам——23%
ввел бы строгую цензуру—9%

Чем вы пользуетесь чаще:

услугами кинотеатров—15%
видеосалонами—5%
ограничиваюсь телевизором—65%
личным видеомагнитофоном—15%

● СООБЩАЕМ ПОДРОБНОСТИ

КУРС ДЕРЕВЯННЫХ ПАДАЕТ, МЕДНЫХ — ВЗЛЕТАЕТ

АЛЕКСАНДР МОЛЧАНОВ, БелаПАН.

РЕШЕНИЕ Совета Министров Республики Беларусь о порядке расчета за продовольственные товары исключительно национальными купюрами, безусловно, повергло в панику многих граждан.

Где, когда, в каких размерах можно будет избавиться от «советских», заменив их родными «зайцами»?

Судя по официальным правительственным заявлениям, это ни для кого не составит особого труда.

Жители республики смогут обменять российские деньги по месту работы или в любом отделении сбербанка не более пяти тысяч в месяц. Гражданам ближнего зарубежья, прибывающим в Беларусь по служебным делам, обмен будет производиться на предприятиях, куда они командированы. 250 рублей в день, переведенные в национальные купюры, возможно, не дадут им умереть с голоду в Беларуси.

Тем, кто приехал к нам в гости не по службе, вне зависимости от срока пребывания, обменяют всего лишь 2 тысячи «деревянных». А заодно — за услугу потребуют 30 процентов от общей суммы обмена.

Зато обладатели монет достоинством 1, 2, 3 и 5 копеек смогут немного поправить свое финансовое положение, так как их реальная стоимость увеличивается в 10 раз. Курс монет 10, 15 и 20 копеек остается прежним.

● ДЗЕЛАВЫ МІНСК



ШЭНЬЧЖЭНЬ — БЕЛАРУСЬ: ПРАЦЯГ ДЫЯЛОГУ

Р. МІКАЛАЕЎ, фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

ДНЯМІ ў Саюзе прадпрымальнікаў Беларусі ў Мінску пабывала дэлегацыя кітайскіх дзелавых колаў з Шэньчжэньскай свабоднай эканамічнай зоны. Той самай, якую ў пачатку бягучага года наведала беларуская ўрадавая дэлегацыя на чале з прэм'ер-міністрам рэспублікі В. Ф. Кебічам. Віцэ-мэр горада Шэньчжэнь ЧЖАН ХОН І, іншыя члены кітайскай дэлегацыі расказалі беларускім прадпрымальнікам аб ходзе правядзення сваіх эканамічных рэформ, якія дазволілі за дванаццаць апошніх гадоў зрабіць сапраўдны пераварот у эканоміцы.

Вось некалькі лічбаў, якія прывялі ў якасці прыкладу госці: калі сярэднегадавы даход на кожнага жыхара эканамічнай зоны ў 1980 годзе складаў 700 народных юаняў, дык летась ён быў ужо 5000. Паспяхова выконваюцца і іншыя сацыяльныя і эканамічныя праграмы, у тым ліку па забеспячэнню жыллём. А раней жа Шэньчжэнь быў вельмі адсталым і бедным раёнам.

Як паведамілі кітайскія сябры, адной з асноўных умоў росквіту зоны з'явілася прадуманая і гібкая палітыка ўрада Кітая. Асабліва ў адносінах да прадпрымальніцтва, якое тут усебакова стымулюецца і заахвочваецца. У адрозненне, між іншым, ад той, якая пакуль што праводзіцца ў Беларусі і ад якой стогнуць сур'ёзныя прадпрымальнікі і наогул вытворцы і, наадварот, жыруюць карумпіраваныя структуры, якія не маюць нічога агульнага з сапраўдным прадпрымальніцтвам.

Прэзідэнт Саюза прадпрымальнікаў Беларусі У. М. Карагін, віцэ-прэзідэнт А. Ф. Калінін, дырэктар акцыянернага таварыства «Цэнтр-XXI век», намеснік дырэктара арэнднага прадпрыемства «Белатракцыён» Л. В. Лявонаў і іншыя прадстаўнікі беларускіх дзелавых колаў расказалі кітайскім калегам аб першых кроках, якія робіць прадпрымальніцтва ў нашай рэспубліцы, намецілі шляхі і напрамкі далейшага супрацоўніцтва.

НА ЗДЫМКУ: члены кітайскай дэлегацыі ў час сустрэчы ў Саюзе прадпрымальнікаў Беларусі.

● КУЛЬТУРА

БЕЛАРУСЬ — В ЧИСЛЕ ПЕРВЫХ

РИД.

В 1954 ГОДУ большинство стран Западной Европы, а также Советский Союз подписывали Европейскую культурную конвенцию. После распада СССР советские республики оказались в этом смысле не у дел. Беларусь одной из первых «бывших» получила приглашение оговорить условия нового подписания этого документа. В воскресенье делегация нашего министерства культуры вылетает в Страсбург, где находится штаб-квартира Совета Европы.

Культурная конвенция предусматривает пропаганду европейских языков, истории и других культурных ценностей в разных европейских государствах. Если под документами конвенции появится подпись представителя Беларуси, то это явится реальным шагом по интеграции нашей республики в общеевропейский дом.

● ФАКТ

НА АДЗІН ТЭАТР БОЛЬШ...

ІРЫНА МАСЛЯНІЦЫНА, «ДВ».

ЗУСІМ нядаўна спектаклем «Імжа» пачаў сваю дзейнасць новы беларускі тэатр «Дзе-Я!»

Дарэчы, з артыстамі яго мы ўжо мелі магчымасць пазнаёміцца на апошнім свяце горада. Новы тэатральны калектыў быў зарэгістраваны ў Міністэрстве культуры Беларусі і адразу прыцягнуты да канкрэтнай работы па арганізацыі свята. І трэба заўважыць, што ўжо тады мінчане былі заінтрыгаваны цікавым, непадобным на іншыя тэатры стылем «Дзе-Я!»

У самым канцы кастрычніка мы атрымалі магчымасць пазнаёміцца з тэатрам бліжэй. Першы спектакль гэтага калектыву прайшоў даволі паспяхова. Як складзецца далей яго творчы лёс—пакажа час.

● СІТУАЦЫЯ

НА ПАРАДКУ МІТЫНГУ — РЭФЕРЭНДУМ

ТАЦЦЯНА ЛАЗОЎСКАЯ, карэспандэнт «ДВ».

БЕЛАРУСКАЯ сялянская партыя падала заяўку ў гарвыканкам на правядзенне 15 лістапада на плошчы Незалежнасці мітынгу.

— Мы маем намер весці з людзьмі размову аб недапушчальнасці ўвядзення ў рэспубліцы калектыўнай формы ўласнасці, якая ўключана ў законапраект Вярхоўнага Савета «Аб праве ўласнасці на зямлю»,—сказаў старшыня сялянскай партыі Я. М. Лугін.—На парадку дня мітынгу таксама пытанні аб правядзенні рэферэндуму і аб сродках масавай інфармацыі, большасць з якіх знаходзіцца ў руках урада, чаго, дарэчы, няма ні ў адной з цывілізаваных краін свету.

● ЭХО СОБЫТИЯ

Иллюстрация МАРАТА ВРУБЛЕВСКОГО. БелаПАН.

НЕСМОТРЯ на ненастную погоду, приверженцы социалистического пути развития общества все же отпраздновали 75-летие Великого Октября. Да еще как! Со всеми атрибутами: красными флагами, праздничными речами, возложением венков и гирлянд, массовым шествием под грохот пролетарских маршей в исполнении духового оркестра.

А затем участники празднества и вовсе вспомнили старые революционные традиции. Со сцены в детском парке имени пролетарского писателя М. Горького выступавшие призывали участников мероприятия продолжить борьбу за распространение по всему миру революционных идей, гневно клеймя при этом позором нацдемов и прочих демократов, которые, по их мнению, привели к всеобщему развалу некогда могучую империю под названием СССР.

И уж вообще не социалистически выглядели буфеты, торговавшие сигаретами явно капиталистического происхождения, шоколадом, а также водкой и шашлыком.

Что ж, праздник есть праздник. И неважно, чему он посвящен. Главное, чтоб весело было. Но, увы, не было.





● КРИМИНАЛ-СЛУЖБА «ДВ»

СЕРГЕЙ РАЧИЛА. (Пресс-центр УВД Мингорисполкома).

В СТИЛЕ «ГЕСТАПО»

ИЗ КВАРТИРЫ в Московском районе в детский хирургический центр бригадой «Скорой помощи» доставлены две малолетние девочки: 11-летняя Алеся и 9-летняя Мария. Диагноз: черепно-мозговые травмы легкой степени, сотрясение мозга, множественные ушибы рук, ног, других частей тела.

Вскоре было установлено, чьих это рук дело. Оказалось, что с 28 октября по 7 ноября над детьми систематически издевался 42-летний отчим: бил деревянной палкой, заставлял стоять на коленях на песке, обливал раздетых детей холодной водой, не давал малышам спать, кормил один раз в сутки.

Предварительно установили, что «воспитатель» наказывал девочек за якобы уворованные деньги. Известно также, что мать несчастных ранее лишалась родительских прав...

ВИТЕБСКАЯ «АБЛИГАЦИЯ»

СОТРУДНИКАМИ оперативно-поискового отдела УВД Мингорисполкома на Комаровском рынке задержана ранее неоднократно судимая жительница Витебской области А.

...17-летней студентке С. («с подачи» поисковиков) повезло — уворованные из ее кошелька шесть тысяч рублей в Витебскую область не уехали...

«СЕМЕЙНЫЙ ПОДРЯД»

В НАЧАЛЕ октября на улице Опанского двумя неизвестными был ограблен минчанин Д. В субботу установлено, что в роли грабителей выступили супруги М. (мужу — 35 лет, жене — 27). Глава семьи ранее был судим за кражу. Похоже, предыдущий «промысел в одиночку» ему не подошел...

А 52-летний шофер МАЗа взял в подручные не жену, а... сына. С применением насилия и к тому же пьяные, они отняли шапку из меха бобра у инвалида второй группы. Оба задержаны и водворены в изолятор.

ТОЖЕ ИЗ ЧИСЛА «КОНФЛИКТОВ ПОКОЛЕНИЙ»!

В ВОСКРЕСЕНЬЕ у 28-летней жительницы Заводского района А. из квартиры пропал кошелек, в котором находилось 12 тысяч рублей и 30 долларов США. Оказалось, здесь «руку приложил» 58-летний пенсионер, являющийся ... отцом потерпевшей.

А может, просто забыла про родителя! Вот он и «напомнил» о себе...

● ЭКОНОМИКА И ВЛАСТЬ

ТРЕТИЙ ГОД КРИЗИСА

МАКС КУНЯВСКИЙ, профессор.

[Окончание. Начало в №№ 211, 212].

III. И КАК ЖЕ ТЕПЕРЬ БЫТЬ!

В ПЕРВУЮ очередь необходимо создать программу преодоления спада производства и структурной перестройки народного хозяйства республики. Эти две задачи не могут решаться в отрыве одна от другой. Мероприятия по модернизации включат опорные пункты народного хозяйства: предприятия, организации, развитие которых должно привести к новым структурам и преодолению спада производства. Поскольку, как мне известно, вокруг разработки методики такой программы бушуют дискуссии, они в основном и являются тормозом ее создания. Хотелось бы высказать некоторые соображения на этот счет.

Прежде всего надо обосновать систему критериев преобразования структуры народного хозяйства и договориться об этих критериях. Затем с их помощью провести оценку всего производственного потенциала нашей республики. В результате мы получим систему приоритетов (от первостепенных до менее значимых), а следовательно, смогли бы выстроить экономическую политику, дифференцированную по конкретным отраслям, предприятиям, организациям и т. д. Механизмами выполнения этой политики должны стать рыночные рычаги: налоги, цены, кредиты, бюджетные дотации, ограничения и т. д. Но наиболее важный вопрос — о критериях. Такими, мне думается, необходимо принять следующие.

Определить набор продуктов, промышленных товаров и услуг, которые необходимы для нашего народа и которыми мы можем обеспечить население, опираясь прежде всего на собственное производство и собственную сырьевую базу.

Свести к минимуму объем ввоза и сбалансировать потребности в сырьевых и энергетических ресурсах. Достигнуть его можно двумя путями: создать собственную энергосырьевую базу и снизить энергоемкость и материалоемкость производства. Другими словами, жесткие лимиты на сырье и энергию должны выступать в качестве одного из главных критериев структурной перестройки. Добьемся ли мы на практике этого? Ведь это чрезвычайно трудно в условиях, когда мы не привыкли считать расход ресурсов. Благодаря этому резко снизилась бы наша зависимость от определенных государств. В рамках этого критерия должно быть предусмотрено существенное расширение производства импортнозамещающей продукции у нас в республике.

Важным критерием должно стать обеспечение максимальной занятости трудового населения. Для этого необходимо дать простор для развития малого и среднего бизнеса, активизировать инвестиции, капиталовложения наших предприятий и зарубежных партнеров.

В числе критериев должны быть: запрет на разрушение окружающей среды, а также достижение минимума потерь при переработке собственных сырьевых ресурсов и изготовлении конечной продукции.

Такая программа должна быть положена в основу всех других программ, всего программирования как средства экономической политики.

В соответствии с программой определяются недостающие производства, которые могут быть с минимальными капвложениями созданы в ближайшие годы. Будут решены и другие очень важные проблемы.

Хочется подчеркнуть, что выводы программы стоит положить в основу формирования бюджетной и налоговой политики. Налоговая политика должна претерпеть как минимум следующие изменения: во-первых, надо сократить количество видов налоговых платежей. Следует выделить сборы, которые ныне представлены в виде налогов, а многие виды налогов спустить на уровень регионов и местных Советов. Налоги следует ограничить следующими видами: налог на прибыль (доход); налог на добавленную стоимость, дифференцированный по видам продукции и рынкам сбыта; налог на недвижимость; акцизный налог и подоходный. Суммарная величина налоговых платежей и сборов не должна превышать 50 процентов валового дохода хозяйственного субъекта. Льготы по налогам должны вводиться исключительно по видам деятельности. Сюда должны быть включены принципиально новые виды товаров и услуг, которые пользуются спросом и могут быть поставлены на экспорт, прогрессивные научно-технические разработки, средства, направленные на образование, здравоохранение и культуру, создание рабочих мест, и прежде всего для инвалидов и малообеспеченных, а также средства, направленные на охрану природы, осуществление чрезвычайных работ. Льготирование по налоговым платежам должно быть сравнительно продолжительным (в течение 3—5 лет) — для создания уверенности у производителей, для стабильности их деятельности.

Нужна ответственная бюджетная политика с разумным подходом к дефициту госбюджета. Покрывать дефицит надо исключительно выпуском и продажей ценных бумаг, фиксированными процентными ставками под залог приватизированного государственного имущества.

Надо ужесточить санкции для налогоплательщиков, уклоняющихся от уплаты налоговых сборов.

В области кредитной политики было бы необходимо наряду с общегосударственными банками создать целевые коммерческие банки с собственным режимом управления или со стороны национального банка за счет средств предприятий, организаций, включая и негосударственные для долгосрочного кредитования. Практическую ценность создания таких банков демонстрирует Япония.

Чрезвычайно важно повышать управляемость в народном хозяйстве. Идти надо жестко и последовательно, реорганизуя структурное управление по вертикали, четко различая принцип разделения властей, существенно сократив количество представителей власти и их функции на местах. Необходимо укрепить суд и правоохранительные органы, повысить их авторитет и действенность.

● ДАЙДЖЕСТ «ДВ»

РЕГИОНАЛИЗМ ПРИБАЛТИКИ МАЛОВЕРОЯТЕН В БЛИЖАЙШЕМ БУДУЩЕМ

ДЖИМ ШЕВИС, ЮСИА.

ВАШИНГТОН. Регионализация Прибалтики — объединение Эстонии, Латвии и Литвы в единую общность, по словам АНДРЕЙСА ПЛАКАНСА, специалиста по данному региону, вряд ли произойдет в ближайшем будущем.

Выступая на семинаре в Международном центре имени Вудро Вильсона, Плаканс заявил, что «НАЦИОНАЛЬНОЕ ГОСУДАРСТВО ПО-ПРЕЖНЕМУ РАССМАТРИВАЕТСЯ ПРИБАЛТАМИ КАК НАИБОЛЕЕ ПОЛЕЗНЫЙ ИНСТРУМЕНТ САМООПРЕДЕЛЕНИЯ И СОХРАНЕНИЯ КУЛЬТУРЫ». Плаканс сказал, что регионализм Прибалтики был темой обсуждения на различных форумах в этих трех странах в течение определенного времени, в особенности после 1991 года, когда они обрели независимость от бывшего Советского Союза, и что эта тема «БУДЕТ ОБСУЖДАТЬСЯ В БУДУЩЕМ».

Страны Прибалтики — исключение из правил. Сторонние наблюдатели смотрят на них, как на естественную политическую общность. Да и сами прибалты сделали многое, чтобы укрепить такое впечатление. «НО ЕСТЬ РАЗНИЦА МЕЖДУ ВНЕШНИМ ВПЕЧАТЛЕНИЕМ И ТЕМ, ЧТО ПРОИСХОДИТ ВНУТРИ»,— сказал Плаканс. «СКОЛЬКО НИ ИЗУЧАЙ ПРОШЛОЕ, ТАМ НЕ НАЙТИ НИЧЕГО, ЧТО МОГЛО БЫ ПРИГОДИТЬСЯ В КАЧЕСТВЕ ОБРАЗЦА ДЛЯ ТАКОЙ ОБЩНОСТИ. ПРОСТО НЕТ ПОДХОДЯЩИХ МОДЕЛЕЙ». Если и есть одно слово, которое описало бы настроение прибалтов, так это слово «осажденные». Они чувствуют себя под угрозой и борются за выживание на всех фронтах против давления со стороны сил, которые, похоже, объединились против них. Иногда говорят о скандинавском регионе, как о модели, однако Норвегия, Финляндия и Швеция не считают себя в такой же осаде, в которой видят себя прибалты, сказал Плаканс, «ПОКА ЭТОТ АСПЕКТ ЖИЗНИ ОСТАЕТСЯ В СИЛЕ, НЕ БУДЕТ ХОРОШИХ ПЕРСПЕКТИВ ДЛЯ ЕДИНСТВА»,— добавил он.

Культурные факторы в гораздо большей степени, чем политические, говорят против единства Прибалтики. Прибалты боятся потерять свою индивидуальность, свою самобытность. Внешне единство Прибалтики всегда было чем-то привнесенным, а не вытекало из воли народа.

С 1945 по 1991 год, когда страны Прибалтики приобрели независимость от бывшего Советского Союза, они были лишены возможности самостоятельно решать свои дела. Во время второй мировой войны они были под пятой у нацистов. «ПОХОЖЕ, ЧТО ПРИБАЛТАМ НРАВИТСЯ ИХ НЫНЕШНЯЯ ИНДИВИДУАЛЬНОСТЬ,—сказал Плаканс,—ОТЧЕТЛИВО ОЩУЩАЕТСЯ, ЧТО ОНИ НЕ ХОТЯТ БРАТЬ НА СЕБЯ ЧУЖИЕ ПРОБЛЕМЫ, А ЕДИНСТВО РАССМАТРИВАЕТСЯ ИМЕННО ТАКИМ ОБРАЗОМ».

Хотя между тремя государствами Прибалтики «СОТРУДНИЧЕСТВО ВОЗМОЖНО И, ПОХОЖЕ, УКРЕПЛЯЕТСЯ, ОНО СОВСЕМ НЕ ОБЯЗАТЕЛЬНО ДОЛЖНО ВО ЧТО-ТО ПЕРЕРАСТИ».

ЗАЯВА

АПАЗІЦЫІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА ФРОНТУ Ў ВЯРХОЎНЫМ САВЕЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

29 КАСТРЫЧНІКА 1992 года Вярхоўным Саветам Беларусі прынята беспрэцэдэнтная пастанова, паводле якой насуперак Закона «Аб народным галасаваньні (рэферэндуме)» праігнаравана ініцыятыва больш як 442 тысячаў грамадзянаў нашай дзяржавы аб правядзеньні рэферэндуму пра роспуск выбранага за часы непадзельнага кіраваньня КПБ—КПСС парламента і правядзеньні датэрміновых выбараў у новую найвышэйшую ўстанову дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусі.

Вярхоўны Савет гэтым сваім рашэньнем паказаў сваю адкрытую пагарду да рэалізацыі неад'емнага права народа на волевыяўленне, парушыўшы тым самым артыкулы 2 і 5 дзейнай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі, артыкулы 6 і 14 Закона «Аб народным галасаваньні (рэферэндуме)» Рэспублікі Беларусі.

Цэнтральная камісія па рэферэндуму не адзначыла ніякіх парушэньняў Закона з боку Ініцыятыўнай групы рэферэндуму, якія давалі б падставу адхіліць правядзеньне рэферэндуму, аб чым сьведчыць Заключэньне Камісіі. Падпісныя лісты, у якіх Цэнтральная камісія па рэферэндуму выявіла недакладнасьці ў афармленьні, былі аднятыя ад агульнай колькасці падпісных лістоў. Усе астатнія, правераныя Камісіяй падпісныя лісты, былі прызнаныя сапраўднымі і склалі 384318 подпісаў грамадзянаў, што значна перавышае колькасьць, неабходную для правядзеньня рэферэндуму. На аснове гэтага і было прынятае Заключэньне Цэнтральнай камісіі па рэферэндуму і 12 мая 1992 г. перададзена ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларусі. Прэзідыум, ігнаруючы законную волю грамадзянаў, выяўленую ў падпісных лістах, на працягу паўгода не зьбіраў сесію Вярхоўнага Савета і не займаўся пытаньнем пра рэферэндум, штучна адцягваў абавязковае вырашэньне пытаньня.

29 кастрычніка 10-я сесія Вярхоўнага Савета Беларусі з падачы Камісіі па заканадаўству сфальсіфікавала вывады Заключэньня Цэнтральнай камісіі па рэферэндуму і прадставіла як грубыя парушэньні Закона. Але такія парушэньні Закона, калі б яны былі, мог устанавіць толькі суд. У дадзеным выпадку суду падлягае парламент, які прыняў антызаконную пастанову на падставе ім жа сфальсіфікаваных аргумэнтаў. Аднак у нашай дзяржаве няма Канстытуцыйнага суда.

У сувязі з вышэйсказаным мы, дэпутаты Апазіцыі Беларускага Народнага Фронту ў Вярхоўным Савеце, заяўляем, што Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь 12-га скліканьня, адхіліўшы законную ініцыятыву сотняў тысяч грамадзянаў Беларусі аб правядзеньні рэферэндуму пра нечарговыя выбары і роспуск цяперашняга Вярхоўнага Савета, стаў на шлях адкрытага парушэньня законаў, Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі і тым самым фактычна згубіў сваю легітымнасьць. Дзеяньні Вярхоўнага Савета аб недапушчэньні рэферэндуму могуць быць расцэненыя толькі як утрыманьне ўлады незаконнымі сродкамі.

На жаль, кіруючая большасьць у Вярхоўным Савеце Беларусі, якая так нічога і не зрабіла для паляпшэньня жыцьця народа, засьведчыла на гэтай сесіі выразныя тэндэнцыі, накіраваныя супраць існаваньня беларускай дзяржавы і беларускай нацыі. Гэта выявілася ў непрыняцьці новай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі, у тармажэньні эканамічных пераўтварэньняў, у непавазе да дзяржаўнай беларускай мовы і сімвалаў беларускай дзяржавы, у імкненьні ўцягнуць нейтральную Беларусь у ваенны блок з Расеяй, у спробах захаваць адміністрацыйна-сацыялістычны лад і аднавіць КПБ—КПСС. Антыдзяржаўная палітыка ёсьць палітыка антынародная, бо, не маючы сваёй дзяржавы, народ не можа распараджацца вынікам сваёй працы.

У ажыцьцяўленьні рэакцыйных задумаў наменклатуры перашкаджае дзейнасьць аб'яднанай Апазіцыі Народнага Фронту і дэмакратычных партыяў. Мы, дэпутаты Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусі, усьведамляем свае абавязкі перад народам у цяжкі для нашай Бацькаўшчыны час і, нягледзячы ні на што, застаючыся ў жорсткай парламенцкай Апазіцыі, будзем змагацца за аднаўленьне законнасьці, за інтарэсы нашых выбаршчыкаў, нашай Беларусі і яе грамадзянаў.

Мы застаемся паўнамоцнымі прадстаўнікамі нашых выбаршчыкаў, але не лічым для сябе абавязковым прымаць удзел у галасаваньні ў гэтым Вярхоўным Савеце.

Неабходнасьць рэферэндуму, законна засьведчаная воляй 442 тысячаў грамадзянаў Беларусі, не зьнятая з парадку дня. Дэпутаты Апазіцыі БНФ будуць дамагацца адмены антызаконнага рашэньня Вярхоўнага Савета ўсімі даступнымі канстытуцыйнымі сродкамі. Рэферэндум павінен адбыцца.

Мы, дэпутаты апазіцыйнай меншасьці, усе, хто 29-га кастрычніка прагаласаваў за рэферэндум, за выкананьне Канстытуцыі і Закона, застаемся легітымнай часткай гэтага Вярхоўнага Савета, каб не дазволіць яго кіруючай большасьці беспераШкодна парушаць правы чалавека, зьневажаць духоўныя і матэрыяльныя інтарэсы народа, дыскрэдытаваць беларускую дзяржаву, каб дамагчыся датэрміновага спыненьня яго паўнамоцтваў на аснове Закона.

Мы верым у шчаслівую будучыню Беларусі, вольнае і заможнае жыцьцё народа і, адстойваючы законныя інтарэсы і правы людзей, спадзяёмся на іх разуменьне нашай пазіцыі, падтрымку і арганізаванасьць.

Дэпутаты Апазіцыі БНФ:

З. Пазьняк, В. Голубеў, Г. Сямдзянава, С. Навумчык, Л. Зданевіч, Г. Грушавы, С. Антончык, У. Заблоцкі, Ю. Беленькі, Л. Тарасенка, С. Папкоў, Я. Новікаў, І. Германчук, Л. Баршчэўскі, Л. Дзейка, П. Холад, А. Шут, А. Трусаў, В. Какоўка, М. Аксаміт, Я. Глушкевіч, М. Крыжаноўскі, С. Бабачонак, М. Маркевіч, А. Паруль, І. Пырх, Я. Бядулін, В. Малашка, В. Алампіеў, М. Мацюшонак, С. Слабчанка, Я. Цумараў.

● ФОТАПОГЛЯД

▲ ВОСЕНЬ У МІНСКУ.

СЯРГЕЙ БРУШКО.

●МАСКОЎСКІ КАРЭСПАНДЭНТ БЕЛІНФАРМа ПАВЕДАМЛЯЕ:

ДОБРАЯ МІНА ПРЫ ДРЭННАЙ ГУЛЬНІ

Згодна са статыстычнымі данымі, аб'ём вытворчасці ў Маскве за апошні час знізіўся больш чым на 25 працэнтаў. А спажыванне на 42 працэнты, нягледзячы на тое, што зарплата вырасла ў 7 разоў. І на гэтым фоне самы цікавы факт — прыбытак прадпрыемстваў вырас у 10 разоў.

Падобныя з'явы могуць адбывацца толькі ў дэфіцытнай і інфляцыйнай эканоміцы, калі новы рост цэн, на які рабіў стаўку ўрад Гайдара, стымулюе не вытворчасць, а спекуляцыю. Эканамісты лічаць, што і падаражанне энерганосьбітаў забяспечыць толькі звышпрыбытак нафтавікам. Спачатку шахцёры сваё вырвалі, потым нафтавікі. Хто наступны!

МНОГА ДЫМУ З НІЧОГА

Інспектары Маскампрыроды аштрафавалі аўтабазу прэзідэнта Расіі на 100 тысяч рублёў з-за таго, што амаль 25 працэнтаў машын з прэзідэнцкага гаража выходзяць на лінію ў няспраўным стане — з павышаным утрыманнем таксінаў у выхлапных газах.

Як аказалася, у гаражы ёсць усе неабходныя сродкі кантролю і грошы для іх набыцця, але падвяло славутае рускае «авось» і перакананне, што для прэзідэнта і яго прыбліжаных законы не пісаны.

ДЖУНА — ГЕНЕРАЛ АД МЕДЫЦЫНЫ

Прафесар, доктар медыцыны, прэзідэнт Міжнароднай акадэміі нетрадыцыйных метадаў лячэння Джуна Давіташвілі ўзведзена ў чын «генерала ад медыцыны».

КАБ НЕ ЗАГІНУЦЬ З ГОЛАДУ

УЛ. ІНФ. «ДВ».

15 ЛІСТАПАДА Цэнтральная Рада Беларускай сялянскай партыі запрашае дэмакратаў і кансерватараў, гараджан ды вяскоўцаў, старых і маладых, інтэлігенцыю і вайскоўцаў на пляц Незалежнасці, каб выказаць пратэст Вярхоўнаму Савету Беларусі, які ў бліжэйшыя дні збіраецца прыняць Закон «Аб праве ўласнасці на зямлю».

Гэтым законам, гаворыцца ў лістоўцы, зямля, якая належыць усяму народу, будзе аддадзена калгасам і саўгасам у калектыўную ўласнасць. Зямельная рэформа, якая цяпер топчацца на месцы, будзе канчаткова пахавана. Фактычна зямля стане ўласнасцю старшынь калгасаў і іх бліжэйшага акружэння. А ўсе мы пойдзем нанімацца да іх на працу на кабальных умовах.

Калектыўная ўласнасць на зямлю — гэта бомба запаволенага дзеяння для нашага грамадства.

●АРМІЯ І ДЗЯРЖАВА

ГЕНАДЗЬ ЛАГУНОВІЧ.

...НЕ ЛЕПЕЙ І Ў ДУГУ ЗГІНАЦЦА

ХТО УВАЖЛІВА сочыць за маскоўскай перыёдыкай, той не мог не прыкмеціць, як у Расіі ўвесь час нарастаюць імперскія настроі, ідзе распальванне вялікадзяржаўнага шавінізму. Нельга, зразумела, абвінавачваць расійскае кіраўніцтва або грамадскасць, калі яны клапоцяцца аб рускіх, якія засталіся ў былых саюзных рэспубліках. Але ж ці можна гэта рабіць так, як робяць некаторыя военачальнікі суседняй краіны? Не варта ўспамінаць пра ваяўнічыя заявы генерала **А. ЛЕБЕДЗЯ** — ён камандуе толькі адной арміяй. А вось міністра абароны **П. ГРАЧОВА** хацеў бы працытаваць: **«Я уже неоднократно говорил, что мои позиции очень жесткие. Если будут ущемлены честь и достоинство русского населения... мною будут приняты самые решительные меры, вплоть до ввода войск»** («Независимая газета» ад 18 жніўня г. г.). Мабыць, каб ніхто не сумняваўся, што можа стацца пасля гэтага, генерал Грачоў удакладніў: ён будзе **«защищать русских, где бы их ни обидели, до последней капли крови»** («Комсомольская правда» ад 29 жніўня г. г.).

Могуць сказаць: міністр, напэўна, не меў на ўвазе Беларусь, бо ў нас ніхто не крыўдзіў і не збіраецца крыўдзіць яго суайчыннікаў толькі за тое, што яны рускія. Правільна. Але ж у нас і войск, якія выконваюць загады з Масквы, і так паўнюсенька, і хто ведае, што яны будуць рабіць, калі ў «белакаменнай» пачнецца якая-небудзь палітычная завіруха. Нялёгка прадказаць паводзіны ў экстрэмальнай сітуацыі і шавіністычна настроеных цывільных, якія жывуць на нашай зямлі, але адчуваюць нянавісць да ўсяго беларускага. Некаторыя з іх ужо зараз папражаюць, што будуць прасіць у Расіі дапамогу, калі тутэйшыя «националисты» не адкажуцца ад беларускага Адраджэння, ад матчынай мовы. Няўжо сапраўды — чым чорт не жартуе! — «интернационалисты» збіраюцца ўсталёўваць так званае «двуязычие» агнём на паражэнне?

Мусіць, меў рацыю мужчына (дарэчы, па нацыянальнасці рускі), якога я бачыў на плошчы Незалежнасці з высока ўзнятым плакатам у руцэ: «Рускія! Калі ласка! Не стварайце Прыднястроўя ў Беларусі». Гэта перасцярога-заклік, здаецца мне, можа быць адрасавана таксама тым рускамоўным вайскоўцам, якім упоперак горла наш дзяржаўны суверэнітэт.

Упэўнены, што знаходжанне на тэрыторыі Беларусі чужога войска, тым больш ва ўмовах цяжкага крызісу, не спрыяе ўнутранай стабілізацыі ў рэспубліцы, не павышае яе знешнюю бяспеку. Хутчэй наадварот. Ці можам мы разлічваць, скажам, на тое, што ракеты заходніх ядзерных дзяржаў, нацэленыя на нашы галовы, пачнуць «зачахляць» раней, чым нашу тэрыторыю пакінуць стратэгічныя сілы Расіі? І ці не рызыкуем мы быць уцягнутымі ў канфлікт паміж Расіяй і іншымі краінамі, калі ваенныя дзеянні, барані Божа, успыхнуць непадалёку ад нашых рубяжоў?

ЗДАВАЛАСЯ Б, чым хутчэй будуць выведзены расійскія часці з Беларусі, тым лепш. А пакуль яны топчуць нашу зямлю, трэба плаціць за яе карыстанне. Але высокапастаўленыя ўрадавыя чыноўнікі праз сродкі масавай інфармацыі імкнуцца ўтлуміць у галовы грамадзян рэспублікі нешта процілеглае. Паслухаць альбо пачытаць некаторых з іх, дык можа здацца, быццам расійскае войска — амаль ці не падараваная нам з неба дапамога, а патрабаванне арэнднай платы за зямлю — «неджэнтльменскі крок».

Разлічаны такія публікацыі на забыўлівых альбо недасведчаных людзей, якім цяжка адрозніць праўду ад хітрыкаў. Вось, напрыклад, кіраўнік саўмінаўскага ўпраўлення грамадскай бяспекі і абароны ў артыкуле «Не спяшайцеся вінаваціць урад» («Народная газета» ад 8 кастрычніка г. г.), вядзе гаворку аб тэрмінах вываду ядзерных сіл з тэрыторыі Беларусі. Нельга гэта зрабіць у адзін момант, піша ён, а вось 7 гадоў — тэрмін рэальны. Паглядзіце, маўляў, як павольна і размерана выходзяць савецкія (?) падраздзяленні з Германіі.

Што ж, давайце паглядзім. Толькі спачатку зробім удакладненні. **Першае.** Ніхто, у тым ліку і апазіцыя БНФ, не патрабуе, каб нашу зямлю пакінулі названыя ў артыкуле **Г. ДАНІЛАВА** 30 тысяч вайскоўцаў імгненна. Грамадскасць крытыкуе ўрад за тое, што калі раней гэта хацелі зрабіць за два гады, то цяпер тэрмін, адпаведна маскоўскім пагадненням ад 20 ліпеня, павялічваецца больш чым у тры разы. **Другое.** Аўтар робіць выгляд, што ён не ведае такі факт: Беларусь яшчэ ўлетку прызнала ўсе ядзерныя сілы, якія знаходзяцца на яе тэрыторыі, расійскімі. Расійскімі, а не савецкімі з'яўляюцца цяпер і часці, якія выводзяць з Германіі.

Але пойдзем далей. Чытачу наўмысна не паведамляецца, што група савецкіх войск у гэтай краіне налічвала каля чатырохсот тысяч чалавек, велізарную колькасць баявой тэхнікі, армейскай маёмасці, а вывад іх, разлічаны на чатыры гады, будзе завершаны датэрмінова. І гэта — нягледзячы на тое, што з прычыны перашкод у транзіце праз Польшчу, шэрагу часцей давялося вяртацца, робячы ледзь не кругасветнае падарожжа. Сусветная ваенная гісторыя дагэтуль не ведала перадыслакацыі такога вялізнага маштабу. Дык ці павернецца яшчэ ў каго-небудзь язык называць яе тэмпы «павольнымі»?

Нагадаю таксама, што спатрэбілася менш за паўтара гады, каб вывесці з Чэха-Славакіі 73 тысячы асабовага складу, 1220 танкаў, 2505 баявых машын, 1218 артсістэм і шмат іншага («Красная звезда» ад 7 жніўня г. г.). Летам мінулага года былыя савецкія Узброеныя Сілы пакінулі Венгрыю, а гэтымі днямі — Польшчу. У выніку значна знізіўся ўзровень ваеннай канфрантацыі ў Еўропе, засталіся задаволенымі грамадскія колы.

КАЛІ прааналізаваць прыведзеныя лічбы і факты, дык сама па сабе напрошваецца выснова: намечаныя тэмпы вываду ядзерных сіл з нашай зямлі вельмі і вельмі марудныя. Невыпадкова ў апошні час у друку з'явіліся выказванні спікера рэспубліканскага парламента аб неабходнасці і магчымасці паскорыць гэты працэс. Але ёсць яшчэ часці і злучэнні, якія перадыслакуюцца з-за мяжы на Беларусь, а падпарадкоўваюцца Расіі. Хто ведае, ці надоўга яны абсталёўваюцца на нашай тэрыторыі?

НАМ ні ў якім разе нельга забываць, як яшчэ некалькі гадоў таму назад зразумела Масква формулу «часовае знаходжанне» вайскоўцаў у «братніх» краінах. Я не ўпэўнены, што цяпер ужо ўсё павярнулася на 180 градусаў. Тым больш, што, напрыклад, вывад расійскіх войск з Прыбалтыкі, які толькі-толькі пачаўся, ужо прыпынены. Прычым першымі сталі ўносіць свае карэктывы ў складзеныя графікі самі афіцэры і іх жонкі. Што тычыцца Прыднястроўя, дык генерал Грачоў сказаў журналістам: часці 14-й арміі ўкамплектаваны вайскоўцамі гэтага рэгіёна, **«и они вряд ли согласятся выполнить приказ о выводе, если в их родных местах не будет спокойно»** («Известия» ад 15 кастрычніка г. г.). Параўнайце гэта выказванне з тымі, што цытаваліся вышэй, і вы ўбачыце проста-такі імперскую метамарфозу: у першым выпадку (пра ўвод войск) міністр гаварыў дужа жорстка і рашуча, у другім (пра вывад іх) — занадта мякка і нават разгублена.

...НА ЖАЛЬ, у дзеяннях нашых уладатрымальнікаў, асабліва калі закранаюцца пытанні знаходжання на беларускай зямлі чужога войска, часам і праз лупу са шматразовым павелічэннем не разглядзець сапраўднай заклапочанасці аб нацыянальна-дзяржаўных інтарэсах Беларусі. А вось паклоны ў бок усходняга суседа і яго ўзброеных сіл добра былі б бачны і ў перавернутым бінокле. Вядома, у позу забіякі ў адносінах да Расіі (а чаму толькі да яе?) станавіцца нельга — тут аўтар «афіцыйнага пункту гледжання» і яго аднадумцы маюць рацыю. Аднак не лепей і згібацца ў дугу, бо, калі ў нас не прачнуцца пачуцці нацыянальнай самасвядомасці і ўласнай годнасці, — нам ніколі не вырвацца з жалезных абдымкаў «старэйшага» брата.

● МЕРКАВАННЕ

ХЛЕБ І БАРАЦЬБА—РЭЧЫ РОЗНЫЯ

К. ІВАНОЎ.

Як сцвярджаюць мовазнаўцы, слова «хлеб» мае грэчаскія карані. Менавіта ў старажытнай Грэцыі хлебапёкі карысталіся для яго вытворчасці спецыяльнымі глінянымі гаршкамі — «клібанос». Пазней назва гаршка трансфарміравалася і ўвайшла ў мову старажытных славян, германцаў і іншых народаў. У германцаў мелася слова «хлайб», падобнае да рускага і беларускага «хлеб», украінскага «хліб», і літоўскага «лайб».

У старажытным Рыме існавалі пякарні з, кажучы па-цяперашняму, шырокім асартыментам хлебабулачных вырабаў. Па памятніку рымскаму хлебапёку Марку Вергіліусу Еўрузалесу, які жыў дзве тысячы гадоў таму назад, зроблены барэльефы, на якіх адлюстравана тагачасная тэхналогія выпечкі.

«Хлеба і відовішч» патрабавалі простыя рымляне, але і дзяржаўныя асобы добра разумелі значэнне хлеба для палітыкі. Можа таму французскі кароль Генрых IV да сваіх шматлікіх тытулаў дадаў яшчэ і званне «Караля хлеба». І наадварот, жонка Людовіка XVI — Марыя Антуанета, легкадумна ўсклікнуўшы, што калі ў французаў — нямашака хлеба, хай ядуць піроржныя, ахвяравала і сваёй галавой, і галавой мужа.

Вельмі цяжка ў гэта паверыць, але напачатку першай сусветнай вайны, якая адрэзала Расію ад еўрапейскага рынку, вядомы эканаміст -аграрнік А. Чаянаў пісаў, што яна прывядзе да затаварвання хлебам. Што далей адбылося, і як «абсолютное обнищание народных масс» стварыла «революционную ситуацию», пра гэта можна толькі здагадацца, але з перамогай спачатку Лютаўскай, а потым і Кастрычніцкай рэвалюцый, вытворчасць хлеба ў краіне скончылася і пачалася барацьба за яго. І цягнецца да гэтай пары.

З вясны па восень барацьба пераходзіць у бітву. Толькі вядзецца яна неяк дзіўна. Успомнім. Піцерскі матрос, абураны ўспамінамі пра «суровое детство» пры царскім рэжыме, з'яўляецца з мандатам на хутар Грэмячы Лог і нішчыць там «культурного хозяина» Якова Лукича. Потым сам бярэцца за чапянігі і паказвае «трудовому казачеству», як трэба араць, каб было і глыбока, і многа...

Але нешта не выйшла, нягледзячы на дапамогу мясцовых актывістаў і дзеда Шчукара. Прыйшлося расшыраць «тэатр ваенных дзеянняў», кінуць Расію і рушыць на цаліну. Дзе цяпер тая Цаліна, у якой дзяржаве?

У вядомай камедыі Арыстафана жанчыны на чале з Лісістратай, якім надакучыла разбуральная для сямейнага ладу вайна, вырашаюць не дапускаць да сябе мужчын, пакуль яны не кінуць дурную бойку.

Вось і нашу зямельку, як і тую Лісістрату, ніхто не шануе, не мілуе як трэба. Вось і атрымліваецца: грэкі, італьянцы, германцы і ўсе астатнія — з хлебам, а мы каторы год — у барацьбе за яго.

● СЕГОДНЯ — ДЕНЬ МИЛИЦИИ

БОРИС ПИЛИПЕНКО,
начальник УВД Мингорисполкома.

И В БУДНИ, И В ПРАЗДНИКИ

Потускнели, уходят в прошлое профессиональные праздники. Не слышно аллилуйи и здравиц в честь вождей и партий. Таковы приметы сегодняшнего времени. Люди обременены уймой забот и, в частности, все больше своей безопасностью и сохранностью имущества. Полагаю, в День милиции, который, как своеобразный рубеж, мы отметим без помпы, но с достоинством, об этом стоит поговорить.

Подведение окончательных итогов нынешнего года еще предстоит. Но уже сейчас нужно отметить, что на фоне множества проблем политического, экономического и социального характера сотрудники органов и подразделений УВД Мингорисполкома стремятся достойно выполнить свой конституционный долг. Не секрет, обстановка в нашей столице с каждым годом заметно ухудшается. Тому есть десятки и сотни причин. Но в нынешнем году мы постарались сделать все от нас зависящее, чтобы никто из горожан и гостей Минска не чувствовал и тем более не страдал от этой напряженности.

За 9 месяцев нынешнего года количество зарегистрированных преступлений возросло более чем на 25 процентов. Говоря о серьезных преступлениях (убийства, изнасилования, факты причинения телесных повреждений и т. д.), отмечу, что в этом году они не внесли существенных изменений в общую картину криминогенной обстановки. Ни в лучшую, ни в худшую сторону. Более того, в ряде случаев наблюдается снижение уровня этих преступлений. К примеру, на 40 процентов удалось снизить покушения на убийство, на 25 процентов — краж оружия, мошенничества.

Но, увы, тревожит всплеск разбойных нападений (на 50 процентов), грабежей (на 59), злостного хулиганства (на 34) и особенно — значительный рост краж государственного, общественного и личного имущества, которые и снизили нам все показатели и наверняка вызывают тревогу наших горожан.

Уже замечено, на любые проявления нестабильности в обществе уголовный мир отвечает активизацией своих сил. Именно это происходит и сейчас. В мутной водичке переходного периода ловят свою рыбку все, кому не лень. Общество, в свою очередь, обращает недоуменные взоры в сторону правоохранительных органов. И это правильно. Но и нас нужно понять. Этот шквал преступлений остановить лишь только нашими силами и средствами невозможно. Не стану живописать наши трудности, они у всех на виду. Излишне апеллировать и к городским властям. Бюджет столицы и без того напряжен. Но как же быть? Думаю, помимо координации усилий всех заинтересованных сторон, нужно поставить заслон расхлябанности и ротозейству, безответственности и легкомыслию.

Резервы здесь огромные. Судите сами, только в нынешнем году количество краж с территории государственных предприятий и учреждений достигло отметки почти в полторы тысячи (в прошлом году — 883). Анализ показал, что этот рост напрямую связан с низким качеством работы ведомственной охраны территорий многих баз, складов, строительных объектов и т. д.

